**Тэкст дыктанта**
**для правядзення уступных іпытаў па беларускай мове**
**ў ДУА "Мінскае абласное кадэтскае вучылішча"**
**8 клас**

## Купалле

Святкаванне Купалля адбываецца на ўзбярэжжы ракі ці возера. Калі побач няма вады, то выбіраецца якая-небудзь лясная палянка. Цэнтральнае месца, вакол якога разгортваецца свята, займае рытуальны агонь.

Удзень хлопцы для купальскага вогнішча рыхтуюць дровы, галлё, салому. Шмат клопатаў маюць і дзяўчаты. Яны разыходзяцца па лугах, палях, лясных ускраінах і збіраюць кветкі для абрадавых вяночкаў.

Вакол купальскага агню гульня, вясёлыя карагоды, песні. Як толькі полымя трошкі ападае, хлопцы і дзяўчаты скачуць праз агонь. Нашы продкі лічылі, што купальскі агонь валодае ачышчальнай сілай. Пад раніцу хлопцы і дзяўчаты пускаюць на ваду вянкі, купаюцца у ранішняй расе, у рацэ. Вада на Купалле дапамагае стаць чыстым і прыгожым, засцерагае ад розных хвароб. *(108 слоў) З газеты «Звязда».*